яе грудное дзіця — расстраляны ў жніўні 1943.

**ЛІС Пракоп Парфіравіч**, н. у 1910,

**МАЗУРКЕВІЧ Юлія Валянцінаўна**, н. у 1914,

**МАЙСТРОВІЧ Вольга Дзмітрыеўна**, н. у 1927,

**МАЙСТРОВІЧ М. Г.**, н. у 1927,

**МАРЦІНОВІЧ Міхаіл Рыгоравіч**, н. у 1911 — расстраляны ў 1943.

**МУДРАГЕЛЬ Іван** (4 гады), забіты ў 1943.

**НІКІЦЕНКА Пётр Іосіфавіч**, н. у 1924, вывезены ў 1942 на работу ў Германію, там і загінуў.

**ПАСЕЧНІК Васіль С.**, н. у 1884,

**ПЯЧКОЎСКАЯ Лідзія Фёдараўна**, н. у 1928,

**ПІВАВАРАЎ Антон Пятровіч**,

**ПУГАЧЭНКА Адам Анісімавіч**, н. у 1924 — расстраляны ў 1943.

**ПУГАЧЭНКА Уладзімір А.**, н. у 1912, расстраляны ў ліпені 1943 за сувязь з партызанамі.

**СМАЛЯНІК Антаніна Фёдараўна**, н. у 1923,

**СМАЛЯНІК Марфа Фёдараўна**, н. у 1927,

**СМАЛЯНІК Яўгенія Фёдараўна**, н. у 1929 — расстраляны ў лесе ў чэрвені 1943.

**СМАЛЯНІК Міхаіл Піліпавіч**, н. у 1911, расстраляны ў 1942 за падпольную дзейнасць.

### ВЁСКА ЧАРАМАШНЯ

Чарамашня — невялікая вёсачка Мазыршчыны. З мінулага стагоддзя тут жыла яўрэйская беднага, якая займалася паляводствам. У 1941 г. усе жыхары загінулі ад фашысцкага генацыду. Больш шасць іх расстраляна ў ваколіцах роднай вёскі...

**ВАЙСАНЕТ Фейга Мееpаўна** (1881 г.)

**ВАЙСМАН Зусь Ісакавіч** (1880 г.), яго жонка **Блюма Неўхаўна** (1881 г.) і іх дзеці **Міхаіл, Самуіл** і **Раіса** (20, 17 і 10 гадоў)

**ВАЙСМАН Лейзар Іцкавіч** (1880 г.), яго жонка **Хана Неўхаўна** (1889 г.) і іх дзеці **Аўраам, Шлёма** і **Якаў** (25, 15 і 11 гадоў) і 2 унукі (9 і 7 гадоў)

**ВАЙСМАН Сара Рувікаўна** (1939 г.)

**ГАФШТЭЙН Сара** (1900 г.) і яе дзеці **Беня, Гірш** і **Давыд** (16, 14 і 9 гадоў)

**КАЦНЕЛЬСОН Мара Неўхаўна** (1896 г.)

**КОЦІК Невах Мардухавіч** (1851 г.) і яго дочкі **Этля** і **Мера**

**РАШКЕС Дора А.** (4 гады) і **Саламон** (3 гады)

**ФРЫДМАН Нахіма Неўхаўна** (1885 г.)

**ФРЫДМАН Рыва Ніселеўна** (1928 г.) і яе брат **Шлёма** (1931 г.)

**ШЭЙКМАН Янкель Шлёмавіч** (1881 г.), яго жонка **Хася Зусеўна** і іх дзеці **Абрам** і **Сіма**

### ВЁСКА ШЧАКАТАВА

**КАШАВЕНКА Соф'я Юльянаўна**, н. у 1895, яе сын **Сцяпан** (11 гадоў), расстраляны ў 1943.

**ПІВАВАРАЎ Макар Фаміч**, н. у 1897, расстраляны ў снежні 1943.

Па матэрыялах філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр і сельскіх Саветаў спіс падрыхтавалі

*Т. Піліпчук, П. Шут*

## Не скарыліся ворагу

Нягледзячы на цяжкія ўмовы акупацыі ў геранчную барацьбу з фашысцкім рэжымам актыўна ўключылася мазырскае патрыятычнае падполле. У складзе нелегальных арганізацый і груп або ў адзіночку гарадскія і сельскія падпольшчыкі выконвалі ролю партызанскіх сувязных, вялі разведку, палітычную работу сярод насельніцтва, учынялі дыверсіі, збіралі зброю і боепрыпасы, медыкаменты і прадукты, адзенне і абутак для партызан, накіроўвалі ў партызанскія атрады папаўненне і г. д.

Патрыятычнае падполле абласнога цэнтра Мазыра ўключала ў сябе членаў разведвальных груп, пакінутых па заданні партыйных органаў і ўпраўлення НКУС Палескай вобласці для дзеянняў у тыле ворага, а таксама падпольныя арганізацыі, якія ствараліся ў Мазыры з ліку камуністаў, камсамольцаў і ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, што трапілі ў акружэнне, іншых патрыётаў.

Яшчэ да прыходу немцаў у Мазыры было створана 7 падпольных разведвальных груп па 3—5 чалавек у кожнай. Кіраўнікамі былі прызначаны В. І. Крыцкі — бухгалтар абласнога аддзела

ахovы здароўя, М. Ю. Майсееў — механік порта Пхоў, Ф. Г. Беленькі — судовы інспектар, М. Я. Рудніцкі — урач санстанцыі, Я. Р. Навасёлава — швачка арцелі індпашыву, К. Р. Ткач — загадчык Жахавіцкай пачатковай школы. Для кіраўніцтва ўсімі групамі быў пакінуты аператыўны работнік органаў дзяржбяспекі А. П. Палякоў (псеўданім П. А. Прымакоў). У Мазыры і раёне былі падабраны канспіратыўныя кватэры. Частка падпольшчыкаў не была аб'яднана ў групы. З імі меркавалася наладзіць сувязь пазней, па неабходнасці.

З першых дзён вайны было бачна, што гітлераўцы, ствараючы акупацыйны апарат, робяць стаўку на пацярпеўшых ад Савецкай улады. З улікам гэтага частка будучых падпольшчыкаў была «рэпрэсіравана» па палітычных матывах і пасаджана перад прыходам немцаў у турму. Так удалося «ўладкаваць» В. І. Крыцкага бургамістрам Мазыра, М. Ю. Майсеева — бургамістрам Мазырскага сельскага раёна, Я. У. Сілівончыка — загадчыкам аддзела працы гарадской управы і г. д. Гэта павялічыла магчымасці падпольшчыкаў у барацьбе супраць акупантаў.

Аднак у першыя месяцы акупацыі фашысты нанеслі ўдары па патрыятычным падполлі. 24 верасня 1941 г. на цэнтральнай плошчы горада быў расстраляны падпольшчык Лутц Юліс Отавіч, яго жонка Лізавета Лявонаўна і дачка Паўліна. У доме гэтай сям'і захоўвалася зброя, харчы і адзенне для партызан. Перад расстрэлам мужная патрыётка Паўліна Лутц кінула ворагам: «Бандыты! Усіх нас не заб'еце!»

У лістападзе 1941 г., выконваючы баявое заданне камандавання, у Мазыры з'явіўся партызан І. Я. Карпаў, якога пазнаў адзін з паліцэйскіх і арыштаваў яго. Пасля жорсткіх катаванняў І. Я. Карпаў быў расстраляны ў мазырскай турме. У гэты ж час каля вёскі Каменка паліцэйскія схапілі і расстралялі падпольшчыка Ш. М. Гафштэйна.



С. П. Ракіцкі



Д. А. Казлоўскі

ЦК КП(б) Б аказваў дапамогу падполлю Мазыршчыны. У нашым тыле, каля Бранска, вялася кароткачасовая падрыхтоўка арганізатараў падпольнай і партызанскай барацьбы для акупіраванай Беларусі. З ліку тых, хто прайшоў падрыхтоўку, у раён Мазыра былі накіраваны Ц. Я. Абрамаў, К. С. Гаруля, С. П. Пакацін, С. П. Ракіцкі і іншыя, якія паспяхова дабраліся да месца дыслакацыі і ўключыліся ў падпольную работу восенню 1941 г.

У верасні — лістападзе 1941 г. у Мазыры сфарміравалася падпольная патрыятычная група з 10 чалавек на чале з Д. А. Казлоўскім. У яе ўваходзілі М. С. Казарэз, С. П. Ракіцкі, С. П. Раднеўскі, А. Ф. Суркоў, Р. А. Чавус, А. І. Крукоўскі, П. М. Гарбарчук, Я. І. Талкачоў, П. Р. Чарнецкі, А. І. Шастакоўскі.

Члены групы прымалі, запісвалі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро, падбіралі і далучалі да падпольнай работы надзейных савецкіх людзей, збіралі зброю, боепрыпасы, вялі разведку, ажыццяўлялі дыверсіі. У лістападзе 1941 г. група наладзіла сувязь з падпольшчыкамі Калінкавіч К. М. Бакуном, М. С. Дзячэнкам і іншымі.

У верасні 1941 г. у Мазыры вакол пакінутага для барацьбы ў тыле ворага В. І. Крыцкага стала групавацца другая падпольная арганізацыя. У яе ўвайшлі М. Ф. Уласенка, Я. І. Бінецкая,

І. М. Міцура, А. П. Кузьміч, М. Ю. Майсееў, А. С. Мураўёў, А. Г. Папрацінская, А. І. Савіч і іншыя. Большасць з іх уладкавалася на працу ў розныя акупацыйныя ўстановы, што дазволіла ім эфектыўна дзейнічаць у падполлі.

Так было і ў вёсках Мазырскага раёна. У канцы гэтага ж года на падпольную работу па месцы жыхарства перайшлі некаторыя партызаны Мазырскага атрада: М. Ф. Уласенка – у Каменцы, І. А. Міцура – у Бабрах, Ф. С. Валасюк – у Белай, М. К. Куцько – у Касцюковічах, Д. М. Гнедзька – у Слабадзе, З. І. Лук'яновіч – у Прудкоўскім сельсавеце, Л. Г. Грамовіч – у Бібікаўскім сельсавеце, Х. А. Урэцкі – у Іванкаўшчыне, Е. Д. Сітнік – у Скрыгалаўскім сельсавеце, М. А. Дубавец – у Мялешкавічах і г. д. Пры садзейнічанні бургамістраў Мазыра і Мазырскага раёна некаторыя з гэтых падпольшчыкаў уладкаваліся на кіруючыя пасады ў сельскія абшчыны.

Патрыёты растлумачвалі насельніцтву сутнасць фашысцкага «новага парадку», інфармавалі яго аб становішчы на савецка-германскім фронце, падбіралі людзей для партызанскай барацьбы, сабатавалі выкананне загадаў і распараджэнняў акупацыйнай адміністрацыі, вываз савецкіх людзей у Германію, камплектавалі ініцыятыўныя групы для стварэння партызанскіх атрадаў. Аднак сярод падпольшчыкаў знайшліся здраднікі. Па іх даносах былі арыштаваны Ф. А. Каменскі, П. В. Падлобнікаў, М. Н. Чуб – у Казіміраўцы, М. А. Дубавец і Х. А. Урэцкі – у Мялешкавічах. Усе ў студзені 1942 г. расстраляны гітлераўцамі ў мазырскай турме.

З першых дзён фашысцкай акупацыі ў барацьбу з захопнікамі ўключылася падпольная камсамольская арганізацыя вёскі Міхалкі, створаная на базе даваеннай пярвічнай камсамольскай арганізацыі. Яе ўзначаліў даваенны сакратар Аляксандр Тарасаў. Міхалкаўскія камсамольцы хутка навучыліся



А. С. Мураўёў



А. І. Савіч

весці работу ў новых умовах. Дзейнічалі актыўна, але асцярожна. Таму не ведалі правалаў. На рахунку арганізацыі нямала баявых спраў, ад распаўсюджвання савецкіх лістовак да параўнальна буйных дыверсій. Менавіта яна стала ў далейшым надзейнай апорай народных мсціўцаў у Міхалках і ў суседніх вёсках.

Падпольныя арганізацыі і падпольшчыкі-адзіночкі летам і восенню 1941 г. дзейнічалі і ў іншых населеных пунктах Мазырскага раёна. Але ў гэты перыяд патрыятычнае падполле не было масавым. На набыццё вопыту барацьбы ў тыле ворага патрэбен быў пэўны час. І ўсё ж дзейнасць патрыятычнага падполля ў 1941 г., нягледзячы на ўсе цяжкасці, з якімі прыйшлося яму сустрэцца ў першыя месяцы акупацыі, спрыяла стварэнню ўмоў для пашырэння сеткі падпольных арганізацый у далейшым.

У 1942 г. актыўна дзейнічала падпольная патрыятычная арганізацыя на чале з В. І. Крыцкім у Мазыры. Працягвалася ўладкаванне членаў арганізацыі ва ўстановы акупацыйнага рэжыму. Так, пры садзейнічанні бургамістра Мазыра В. І. Крыцкага М. Ф. Уласенка стаў бургамістрам Каменкаўскай воласці, І. М. Міцура – старастам вёскі Бабры, што недалёка ад Мазыра.

Патрыёты паспяхова сабатавалі і зрывалі некаторыя мерапрыемствы гітлераўцаў, здабывалі і рэгулярна пера-



Дом, дзе жыў М. С. Казарэз

давалі ў партызанскія атрады разведданыя аб праціўніку. В. І. Крыцкі і М. Ю. Майсееў рассейвалі падазронасць у карнікаў да тых, хто трапіў у поле іх зроку як «ненадзейны», забяспечвалі дакументамі на права жыхарства і перамяшчэнне асоб, якія актыўна змагаліся з акупантамі, аказвалі дапамогу сем'ям савецкіх ваеннаслужачых, забяспечвалі прадуктамі партызанскія групы, праз сваіх людзей распаўсюджвалі савецкія лістоўкі, перашкаджалі акупантам праводзіць рэпрэсіі супраць яўрэяў.

Каб абмежаваць вываз людзей на катаргу ў Германію, М. Ю. Майсееў арганізоўваў фіктыўныя «леспрамгасы» на чале з надзейнымі людзьмі, якія выдавалі дакументы як «працуючым» сотням савецкіх людзей. Для сувязі з партызанамі ў Акцябрскім раёне ён паслаў падпольшчыка В. Смірнова, але той па дарозе быў схоплены паліцэйскімі ў Гарбавіцкай Рудні.

Смелай, мужнай і знаходлівай разведчыцай праявіла сябе член падпольнай групы В. І. Крыцкага Аўгуста Густаваўна Папрацінская, якая да вайны выкладала нямецкую мову ў адной з сярэдніх школ Мазыра. Гітлераўцы прымусова ўзялі яе перакладчыцай у гебітскамісарыят. Чэшцы па нацыянальнасці, ёй яны аказвалі давер. З кастрычніка 1941 г. А. Г. Папрацінская выконвала разведвальныя заданні кіраўніка падпольнай групы. Яна атрымала доступ да сакрэтнай інфармацыі і магла здабываць важныя разведданыя, своечасова папярэджваць аб маючых адбыцца арыштах у горадзе і раёне. У выніку многія запланаваныя карныя аперацыі гітлераўцаў правальваліся. А. Г. Папрацінская наўмысна рабіла недакладныя пераклады даносаў на падпольшчыкаў і іншых патрыётаў, брала многіх на парукі. Такім чынам яна ўратавала многіх падпольшчыкаў. Па яе хадайніцтву былі вызвалены з-пад арышту падпольшчыкі І. А. Міцура і С. П. Раднеўскі.

Цесныя сувязі падпольная арганізацыя В. І. Крыцкага падтрымлівала з камандаваннем Калінкавіцкага партызанскага атрада, куды пасля арышту падпольшчыка М. С. Казарэза ў красавіку 1942 г. улілася большая частка падпольнай групы Д. А. Казлоўскага, а таксама іншыя падпольшчыкі. Сувязь забяспечвала член падпольнай групы В. І. Крыцкага жыхарка вёскі Навікі (каля Мазыра) Ядзвіга Іосіфаўна Бінецкая. На яе кватэру прыходзілі партызаны і падпольшчыкі Р. А. Чавус, Я. І. Талкачоў, Л. Лаеўскі і жонка Р. А. Чавуса Ганна Мітрафанаўна. Сустракаючыся з мужам на кватэры ў Я. І. Бінецкай, Г. М. Чавус перада-




Мемарыяльная дошка на доме, дзе жыў М. С. Казарэз

вала партызанам здабытыя падпольшчыкамі каштоўныя звесткі аб праціўніку. Назад несла ў горад лістоўкі і антыфашысцкую літаратуру.

Фашысты даведаліся, што А. Г. Папрацінская вінавата ва ўцечцы інфармацыі з гебітскамісарыята. Яе арыштавалі і на допытах здзекаваліся асабліва жорстка. Але мужная патрыётка нічога не сказала гітлераўцам і была расстраляна ў жніўні 1942 г.

У 1942 г. працягвалі барацьбу падпольшчыкі ў вёсках раёна. Гэта былі І. Г. Антоненка, І. І. Лагоўнік, М. Ф. Уласенка і іншыя. Яны разам з мазырскімі падпольшчыкамі Р. І. Чавусам, К. С. Гарулем, М. Я. Рудніцкім, П. М. Лузаном у вёсцы Каменка арганізавалі партызанскую групу. Дапамогу зброяй аказалі мазырскія падпольшчыкі В. І. Крыцкі і М. Ю. Майсееў. У гэты перыяд Антоненка і Уласенка ўступілі ў партызанскі атрад С. А. Каўпака і пазней загінулі ў баях. Іншыя партызаны групы цесна ўзаемадзейнічалі з калінкавіцкім атрадам імя Варашылава.

Шырылася народнае супраціўленне нямецкаму «новаму парадку», і акупанты ўзмацнілі рэпрэсіі. Яны павысілі ўзровень цэнтралізаванага кіраўніцтва карнымі аперацыямі. У чэрвені 1942 г. у Мазыры ствараецца цэнтральная жандармерыя на чале з Гансам Кольморгенам. Яму былі падпарадкаваны раённыя жандармерыі ў Калінкавічах, Ельску, Нароўлі, Лельчыцах, жандарскія ўчасткі ў вёсках Скрыгалаў, Рэмязы, на станцыі Славечна, а таксама паліцэйскія падраздзяленні з ліку здраднікаў.

У маі 1942 г. гітлераўцы арыштавалі ў вёсцы Васькаўка партызан П. Гардзеева, С. Вялічку, а таксама Г. І. Рымша і яе брата Ф. І. Бакуна, якія памагалі ім. Праз некалькі дзён усіх іх расстралялі ў мазырскай турме. У гэтым жа месяцы ў Мялешкавічах па даносу здраднікаў за сувязь з партызанамі былі арыштаваны мясцовыя жыхары У. П. Галенка, А. І. Жыльскі (старшыня калгаса в. Млынок), А. А. Кадол, Максім Ражок, І. П. Лузан, Я. Л. Лупіна. Яны былі расстраляны ў ліпені 1942 г. у рове каля вёскі Бабры.

Пачынаючы з чэрвеня — ліпеня 1942 г. СД, жандармерыя і паліцыя прыкладаюць шмат намаганняў, каб выявіць ядро патрыятычнага падполля. Многія падпольшчыкі арыштоўваліся па некалькі разоў, але гітлераўцы не мелі канкрэтных доказаў іх антыфашысцкай дзейнасці, і пасля жорсткіх допытаў яны адпускаліся на волю. Патрыёты працягвалі барацьбу.

Аднак гітлераўцам удалося ўсё ж заслаць у рады падпольшчыкаў сваю агентуру з ліку мясцовых здраднікаў. У характарыстыцы з выпадку прадстаўлення жандара Ганса Кольморгена да ўзнагароды медалём «За асобыя заслугі» яго жытомірскае начальства пісала: «Восенню 1942 г. пад яго кіраўніцтвам была выкрыта вялікая група бандытаў, добра закансшіраваная, кіруемая афіцэрамі Чырвонай Арміі. Былі канфіскаваны радыёпрыёмнікі і перадатчыкі, прыстасаванні для выпуску лістовак, выбуховыя рэчывы і іншае. Арыштавана 90 чалавек, 61 з якіх расстраляны ў інтарэсах бяспекі рэйха».

Цяжкія страты панесла патрыятычнае падполле Мазыра ў жніўні — верасні, а затым — у снежні 1942 г. У засценках СД і жандармерыі загінулі мужныя патрыёты В. І. Крыцкі, М. Ю. Майсееў, А. П. Палякоў, Ц. Я. Абрамаў, Е. В. Сілівончык, А. Ф. Сузько, Е. А. Канаш, І. А. Міцура, М. К. Куцько, браты Рыгор і Карп Лявонавы, А. П. Кузьміч, А. І. Крукоўскі, С. П. Раднеўскі, Д. І. Балеў, І. М. Лапета, маці і сын Тамара і Раман Арцюшэнкі, Я. Н. Пракопчык і іншыя.

У студзені 1943 г. загінулі падпольшчыкі М. В. Загорскі, Ф. Р. Беленькі, В. І. Міхайлаў, А. І. Пашкоўскі, Н. П. Башко, А. К. Мейлах, Д. М. Гнедзька, Е. Д. Сітнік, І. І. Лагоўнік.

Жорсткі тэрор фашысцкіх акупантаў і іх памагатых не спыніў барацьбы



А. Б. Няпомняшчы (злева) і Ф. Глебаў

савецкіх людзей супраць захопнікаў. Удалося пазбегнуць арыштаў групе падпольшчыкаў на чале з А. С. Мураўёвым, якая працягвала барацьбу.

У гады акупацыі гітлераўцы арганізавалі лагер для савецкіх ваеннапалонных — у вёсцы Козенкі, побач з чыгуначнай станцыяй. У студзені 1942 г. з Оўруча ў лагер акупанты прывезлі групу палонных чырвонаармейцаў, сярод якіх быў Аляксандр Барысавіч Няпомняшчы — былы намеснік камандзіра 823-га артылерыйскага палка, радавыя Фёдар Глебаў, Аляксандр Кажэнка, Аркадзь Шчука і Мікалай Грэчка. З іх А. Б. Няпомняшчы стварыў падпольную групу і прыступіў да арганізацыі ўцёкаў ваеннапалонных.

Лагер ахоўвалі салдаты славацкай часці, якія не сімпатызавалі гітлераўцам. А. Б. Няпомняшчы наладзіў кантакты з пісарам часці малодшым сяржантам Янам Быстранам. Ён стаў уключаць падпольшчыкаў у спісы каманд па нарыхтоўцы дроў, што давала магчымасць ім добра вывучыць ваколіцы лагера і наладзіць сувязі з насельніцтвам. Так удалося звязацца ў Козенках з афіцэрам В. Д. Клімавым, што ўцёк з палону, а праз яго — з мазырскімі падпольшчыкамі.

Група з дванаццаці чалавек старанна рыхтавалася да ўцёкаў. Вялася работа сярод славакаў, каб схіліць іх да пераходу на бок партызан. Праз Яна Быстрана меркавалася здабыць зброю. Пастаянную агітацыю сярод славакаў вялі мазырская падпольшчыца Лізавета Клямар, а таксама ваеннапалонныя — падпольшчыкі Ф. Глебаў, А. Кажэнка, М. Грэчка і іншыя.

На бок савецкіх патрыётаў перайшлі славакі Ян Пінтэр, Васіль Станко, Штэфан Шверцал, Ян Зэлінка, Віктар Кенрэра і іншыя. Ян Быстран сустрэўся з партызанамі. У вызначаны час ён па адным, па два пасылаў падпольшчыкаў па дровы. Так ва ўмоўленым месцы была падрыхтавана зброя і форма нямецкіх салдат.

Ноччу 22 лістапада 1942 г. з Козенкаў пайшлі да партызан 15 савецкіх ваеннапалонных на чале з А. Б. Няпомняшчым. Сярод іх было і некалькі славакаў. Праз трое сутак група з баямі прабілася да партызан злучэння С. А. Каўпака. Некалькі чалавек загінулі.

Акрамя падпольных арганізацый у Мазыры і яго ваколіцах дзейнічалі разведчыкі, сувязныя, невялікія падпольныя групы. Адной з іх кіраваў Я. Р. Захаранка. Малодшы лейтэнант Я. Р. Захаранка ў пачатку вайны аказаўся ў палоне, адкуль яму ўдалося ўцячы і дабрацца да сваёй вёскі Мялешкавічы, дзе ён адразу пачаў шукаць сувязі з партызанамі і ўступіў у Ельскі атрад.

Камандаванне гэтага атрада накіравала Я. Р. Захаранку ў Мазыр з заданнем уладкавацца на работу да акупантаў. Ён паспяхова выканаў заданне, сабраў каштоўныя звесткі аб размяшчэнні нямецкіх войск у Мазыры і перадаў партызанам, выратаваў ад масавага расстрэлу жыхароў вёсак Мялешкавічы і Раманаўка. Разведчыку дапамагло знаёмства з Ганнай Іванаўнай Троіцкай, маладой патрыёткай, якая працавала перакладчыцай у гебітскамісарыяце. Яны працавалі разам і неўзабаве сталі мужам і жонкай. Ганна Іванаўна здабывала і перадавала Я. Захаранку звесткі аб арыштах падпольшчыкаў, іх паводзінах на допытах. Здабытыя звесткі дазвалялі партызанскаму каманда-



Ян Быстран



Ян Пінтэр



Е. П. Міцура (Клямар)

ванню ведаць аб намерах гебітскамісарыята і прымаць адпаведныя захады. Падпольшчыкі актыўна распаўсюджвалі лістоўкі ў горадзе і нават у варожых установах. Незадоўга да вызвалення Мазыра гітлераўцы высачылі адважнага падпольшчыка, і ён загінуў.

З развіццём партызанскага руху стала ўзрастаць роля сувязных. Падбіраліся да гэтай небяспечнай работы новыя патрыёты. Сярод іх вызначыўся мазыранін, былы шафёр аблвыканкама П. М. Канопліч. Па заданні партызан ён хадзіў у разведку ў вёску Раманаўка, куды прыходзіла на сувязь Агата Пархоменка. Атрымаўшы ад яе разведданыя, Пётр Максімавіч перадаваў іх Ельскаму партызанскаму атраду.

Актыўна ўдзельнічалі ў Мазыры таксама падпольныя групы М. Говарава, Л. Казлова, Ф. Казлова, М. Радзевіча, А. Радзіеўскага, А. Савенкі, П. Шанько.

25 красавіка 1943 г. быў сфарміраваны склад Мазырскага падпольнага РК КП(б)Б: сакратар М. К. Ільінкоўскі (з 25.4.1943 па 8.1.1944), членамі райкама сталі А. Л. Жыльскі (з 25.4. 1943 па 8.1.1944), П. М. Лузан (з 25.4. 1943 па 8.1.1944). Райкам выдаваў газету «За Радзіму» (рэдактар У. Я. Басак). Выйшла 9 нумароў газеты па 350 экземпляраў кожны.

Мазырскі падпольны райкам ЛКСМБ быў створаны ў маі 1943 г. Яго ўзначаліў кіраўнік адной з падрыўных груп партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава К. С. Гаруля. Склад Мазырскага падпольнага РК ЛКСМБ: сакратары К. С. Гаруля (з 1.5.1943 па 1.10. 1943), Д. С. Каменскі (з 1.10.1943 па 8.1.1944), Р. І. Піваварaў (сакратар па прапагандзе з 14.9.1943 па 8.1.1944); члены райкама Р. І. Піваварaў (з 1.5. 1943 па 14.9.1943), У. Д. Лук'яновіч (з 1.5.1943 па 8.1.1944), Я. Р. Захаранка (з 1.5.1943 па 5.9.1943, загінуў), І. М. Уласенка (з 1.5.1943 па 4.8.1943), М. А. Навуменка (з 1.10.1943 па 8.1.1944).

Вялікую ўвагу камандаванне Мазырскага партызанскага атрада, потым брыгады, падпольныя райкамы партыі і камсамола ўдзялялі разведвальнай рабоце, наладжванню сувязей з дзеючымі і стварэнню новых падпольных арганізацый і груп у Мазыры, сельскіх населеных пунктах, у першую чаргу ў тых, дзе размяшчаліся гарнізоны праціўніка, або паблізу іх.

З вясны 1943 г. разгарнулі барацьбу супраць акупантаў уцалелыя ад арышту ў 1942 г. падпольшчыкі Мазыра. Былы выкладчык Мазырскага педвучылішча А. С. Мураўёў стварыў новую падпольную арганізацыю, у якую ўвайшлі Н. В. Замыка, Н. І. Зуева, К. В. Катлінскі, Е. Ф. Клямар, М. С. Маргунова, Т. Я. Есьман, А. М. Траццякова і В. П. Хархалеў. Падпольшчыкі мелі сувязь з калінкавіцкімі і мазырскімі партызанамі, выконвалі іх даручэнні.

У канцы красавіка 1943 г. Мазырскі падпольны райкам партыі ўстанавіў су-

вязь з кіраўніком групы А. С. Мураўёвым і даручыў яму выявіць у горадзе колькасць камуністаў і камсамольцаў, якія ўцалелі ад масавых арыштаў. Заданне неўзабаве было выканана. А. С. Мураўёў дапамог арганізаваць некалькі явачных кватэр для партызанскіх разведчыкаў і сувязных, а таксама некалькі «назіральных пунктаў», адкуль падпольшчыкі сачылі за перамяшчэннем нямецкіх войск па чыгунцы і на пераправе цераз Прыпяць.

Летам і восенню 1943 г. Палескі падпольны абкам і Мазырскі райкам партыі прадоўжылі работу па рэарганізацыі дзеючых і стварэнні новых падпольных арганізацый з камуністаў і беспартыйных патрыётаў. У іх былі ўключаны і некаторыя падпольшчыкі з арганізацыі А. С. Мураўёва. У лістападзе 1943 г. у Мазыры падпольным райкамам КП(б)Б была створана падпольная партыйная арганізацыя ў складзе Н. В. Замыка, А. С. Мураўёва і В. П. Хархалева. Сакратаром яе быў прызначаны К. Л. Кебец. Крыху раней у Мазыры падпольным абкамам КП(б)Б была створана другая падпольная партыйная арганізацыя ў складзе П. Г. Кузьменкі, П. С. Калганава, І. В. Кунца. Сакратаром арганізацыі быў прызначаны П. Г. Кузьменка. Пачала дзейнічаць і яшчэ адна падпольная арганізацыя з беспартыйных патрыётаў у складзе В. З. Баравік, Валянціны Іванаўны Бабыр і Паліны Дзянісаўны Салавей. Кіраўніком групы стала Валянціна Захараўна Баравік.

Падпольная арганізацыя была створана таксама на станцыі Мазыр з васьмі чалавек. Сакратаром быў прызначаны М. С. Ганчар. Арганізатарам яе быў начальнік разведкі Мазырскай партызанскай брыгады М. С. Кірушкін. Члены гэтых арганізацый у асноўным па заданні партызанскага камандавання вялі разведку сіл працiўніка, распаўсюджвалі антыфашысцкую літаратуру.

Энергічную работу па стварэнні камсамольска-маладзёжнага падполля на тэрыторыі Мазырскага раёна разгарнуў і падпольны райкам ЛКСМБ. Да восені 1943 г. тут было створана 14 падпольных камсамольскіх арганізацый і груп, у складзе якіх налічвалася 58 патрыётаў. Падпольныя арганізацыі ўзначальвалі ў вёсках: Васькаўка (4 чалавекі) — Сяргей Жыльскі, Рудня (3 чалавекі) — Сяргей Басак, Каменка і Бокаў (7 чалавек) — Соф'я Адамаўна Басак, Слабада і Слабодка (8 чалавек) — Сяргей Ліс, Майсееўка і Хамічкі (10 чалавек) — Уладзімір Карабун, Вялікія і Малыя Зімовішчы, Шчакатава (10 чалавек) — Валянціна Максімава, Барыскавічы і Прудок (8 чалавек) — Васіль Басак, Махнавічы (8 чалавек) — І. М. Канопліч (створана Ельскім падпольным РК ЛКСМБ летам 1943 г.). Маладыя падпольшчыкі вялі разведку, здабывалі зброю і боепрыпасы, медыкаменты, распаўсюджвалі антыфашысцкую літаратуру і г. д.

Добрымі разведчыкамі былі камсамольцы-падпольшчыкі з вёскі Слабада Гнедзька і Рэвут. Распаўсюджвалі літаратуру ў Мазыры і іншых населеных пунктах камсамольцы Сцяпан Дашкевіч, Наташа Прус, А. Паўлюк, Васіль Місько. Усімі даступнымі сродкамі шкодзілі ворагу Кацярына Сітнік, Надзя Мылко, Васіль Клявец. Камсамольцы Уладзімір Сідарчук і Сцяпан Дашкевіч спалілі варожую аўтамашыну, расправіліся з гітлераўцамі, якія ў ёй знаходзіліся, забралі зброю. Маладыя падпольшчыкі вёскі Слабада здабылі і перадалі народным мсціўцам 250 кг толу, некалькі вінтовак, боепрыпасы, шмат патронаў.

Актыўна змагалася з ворагам камсамолка-падпольшчыца з вёскі Міхалкі Юля Ахраменка. Яна падтрымлівала сувязь з Нараўлянскім падпольным РК КП(б)Б і выконвала яго заданні, дастаўляла партызанам медыкаменты з Нараўлянскай бальніцы, наладзіла сувязь з афіцэрам чэхаславацкага батальёна, які размяшчаўся ў Міхалках, славакам Янам Генжэлем. Быў распрацаваны план пераходу групы чэхаў і слава-


В. П. Храхалеў


К. В. Катлінскі


Н. В. Замыка


Г. М. Краўчанка (Трацякова)


Г. В. Родэ (Сернікава)


Манзіенка Фёдар Сяргеевіч — кіраўнік групы разведчыкаў. Фота 1976 г.


Навуменка Іван Якаўлевіч — член падпольнай групы Ф. С. Манзіенкі


Лянкевіч Марыя Сідараўна — сувязная падпольнай групы Ф. С. Манзіенкі

каў на бок партызан. 17 мая 1943 г. Юля Ахраменка прывяла ў Нараўлянскі партызанскі атрад славакаў Яна Генжэля, Стэфана Канько, Паўлюка Андро, Яна Крауса, Петра Боршча і іншых. Акрамя таго, яна даставіла партызанам міну, якой пасля была ўзарвана нямецкая камендатура ў горадзе Оўруч.

У маі 1943 г. з падпольнай арганізацыяй А. С. Мураўёва ўстанавіў сувязь камандзір адной з разведвальных груп штаба Беларускага фронту капітан А. І. Яфімаў (Быстроў), а ў чэрвені быў распрацаваны дэталёвы план дастаўкі ў Мазыр радысткі з рацыяй, каб мець прамую сувязь разведгрупы са штабам фронту. Па заданні А. С. Мураўёва камсамолка-падпольшчыца Лізавета Клямар здабыла 12 бланкаў нямецкіх пашпартоў з усімі подпісамі і пячаткамі. Адным з гэтых пашпартоў забяспечылі радыстку З. А. Кулікову. Яе з рацыяй пасялілі ў доме падпольшчыкаў К. В. Катлінскага і Г. М. Трацяковай.

Для аператыўнага збору разведвальнай інфармацыі аб праціўніку ў Мазыры і яго ваколіцах капітанам Быстровым была створана з мазырскіх падпольшчыкаў спецыяльная падпольная разведвальная група з 9 чалавек. Кіраўніком яе быў прызначаны К. В. Катлінскі. У склад групы былі ўключаны А. С. Мураўёў, М. І. Мазуркевіч, Г. М. Трацякова, Н. В. Замыка, Г. В. Родэ (Сернікава), Мікалай Бандарэн-

ка, Т. Я. Есьман — сувязная, З. А. Кулікова (Вольга) — радыстка. Прыцягваліся да вядзення разведкі А. Савіч, М. М. Шулярэнка, М. К. Кунгер і іншыя.

Гэтая мазырская падпольная разведвальная група здабывала і перадавала праз радыстку камандаванню Чырвонай Арміі каштоўную інфармацыю аб перамяшчэнні войск і ваенных грузаў праціўніка праз станцыю Мазыр, цераз Прыпяць, аб ваенных аэрадромах і абарончых умацаваннях у Мазыры. Група дзейнічала да снежня 1943 г.

Мазырскія падпольшчыкі здабывалі нямала каштоўных звестак аб праціўніку і для камандавання партызанскіх фарміраванняў, што давала ім магчымасць праводзіць паспяховыя баявыя аперацыі, своечасова супрацьдзейнічаць карным мерапрыемствам гітлераўцаў. Падпольшчыкі змагаліся з ворагам да вызвалення горада і раёна.

*А. Васько*

### З ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б АБ НАКІРАВАННІ ДЫВЕРСІЙНАЙ ГРУПЫ Ў МАЗЫРСКІ РАЁН ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ І КАМПЛЕКТАВАННІ МАЗЫРСКАГА ФІЛІЯЛА СПЕЦШКОЛЫ

*30 ліпеня 1941 г.*

1. Направить группу Иванова В. Ф. в Мозырский район в составе Шумилина А. М., Мелкозерова А. Л., Щипера Т. Г., Новикова А. И., Юхневича А. И., Родионова П. Ф., Ткачева И. С., Прановича Г. С.
2. В случае занятия района врагом группе вести диверсионную работу...
3. Филиал спецшколы в Мозыре укомплектовать работниками Полесской и Пинской областей: Шмаков, Пилющенко, Образевич, Александров, Костычев, Путин...

*НА РБ. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1214. Л. 56.*

## Як сумленне загадвала

### З успамінаў падпольшчыка А. С. Мураўёва

У вёсцы Хрысцінаўка Палтаўскай вобласці мяне схапілі немцы і павезлі ў лагер для ваеннапалонных у Кіраваград. Удалося ўцячы. У пачатку снежня 1941 г. дабраўся да Мазыра.

У Мазыры ўжо дзейнічалі падпольныя групы і падпольшчыкі-адзіночкі. Адной з такіх патрыятычных груп кіраваў Д. А. Казлоўскі. З ім пазнаёміў мяне К. В. Катлінскі, мой даўні сябар і калега.

Упершыню я прысутнічаў на сходзе падпольшчыкаў у снежні 1941 г. Абмяркоўвалі пытанні: зрыў фашысцкіх мерапрыемстваў, збор зброі, падрыхтоўка людзей для новага партызанскага атрада.

У далейшым нарады і сустрэчы праводзіліся на кватэрах падпольшчыкаў М. Казарэза, А. Суркова, С. Раднеўскага, Д. Казлоўскага, К. Катлінскага і іншых.

Вясной 1942 г. група мазырскіх і калінкавіцкіх падпольшчыкаў пайшла ў лес для арганізацыі партызанскага атрада. Засталіся ў Мазыры на падпольнай рабоце В. Катлінскі, В. Хархалеў, С. Пячкоўскі, А. Шастакоўскі, П. Гарбарчук, А. Суркоў і я. Славацкая камендатура ў Мазыры была заменена нямецкай, уведзены больш строгія парадкі. Каб паказаць сваю лаяльнасць да акупацыйных улад, мне неабходна было ўладкавацца на работу. Я звярнуўся да бургамістра Мазыра В. І. Крыцкага, таксама падпольшчыка, які прызначыў мяне бібліятэкарам. Мы працягвалі распаўсюджваць лістоўкі, савецкія газеты. Газету «Правда» дастаўлялі ад партызан Марта Кунгер, Васіль Хархалеў, настаўніца з вёскі Гостаў Марыя Шулярэнка.

У пачатку 1942 г. В. І. Крыцкі выклікаў мяне ў гарадскую ўправу і прапанаваў заняць пасаду загадчыка школьнага аддзела. Ён мне даў зразумець, што неабходна зрабіць так, каб ні адна школа не працавала. «Школы ад-

крыем тады, калі вызвалім Радзіму ад захопнікаў...» — сказаў ён. Акупанты многа моладзі вывозілі на работу ў Германію. В. І. Крыцкі даручыў мне ўзяць многіх юнакоў і дзяўчат на ўлік і са згоды гебітскамісарыята замацаваць за школамі раёна і горада. Такім чынам было выратавана 120 чалавек.

Некалькі разоў насіў медыкаменты да партызан. Летам 1942 г. падпольшчыкі В. Хархалеў і К. Кебец выкралі ў немцаў станок для набіўкі патронамі кулямётных стужак і перадалі яго ў атрад. Выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, В. І. Крыцкі праз М. Ю. Майсеева і І. А. Міцуру дастаўляў з Мазыра партызанам муку, соль і медыкаменты.

У маі 1942 г. гітлераўцы схапілі і расстралялі М. Казарэза, А. Крукоўскага, перакладчыцу гебітскамісарыята А. Папрацінскую і многіх іншых. Падпольшчыкі, якія засталіся на волі, працягвалі барацьбу з акупантамі. На дарозе Мазыр — Міхалкі група падпольшчыкаў на чале з М. Ю. Майсеевым падарвала аўтамабіль з жандарамі. Павел Гарбарчук з таварышам, працуючы ў немцаў механікам гаража, забіў ахоўніка-паліцэйскага і прыгнаў да партызан легкавы аўтамабіль генерала Веймара.

22 жніўня 1942 г. многія падпольшчыкі былі арыштаваны. Сярод іх — В. І. Крыцкі, М. Ю. Майсееў, І. А. Міцура, Е. В. Сілівончык, Ц. Я. Абрамаў, А. П. Кузьміч і іншыя. Пасля страшэнных катаванняў іх расстралялі, але яны не выдалі сваіх таварышаў па барацьбе.

Месца тых, хто загінуў, у радах падпольшчыкаў займалі новыя патрыёты: Лізавета Клямар, Марыя Маргунова, Ганна Родэ, Галіна Траццякова, камсамолец А. І. Шастакоўскі, Ганна Чавус і іншыя.

3 мая 1943 г. з групай мазырскіх падпольшчыкаў устанавіў сувязь начальнік разведвальнай групы Цэнтральнага фронту капітан Быстроў. У чэрвені на кватэру да Катлінскіх была



М. С. Русецкая (Маргунова). Фота 1984 г.

перапраўлена радыстка Кулікова з рацыяй. Мы збіралі звесткі аб праціўніку. Оля (Кулікова) перадавала іх у Цэнтр. Н. В. Замыка, рызыкуючы жыццём, здабывала звесткі аб руху варожых эшалонаў па чыгунцы Калінкавічы — Оўруч. На станцыі Мазыр разведданыя збіраў М. І. Мазуркевіч, а падпольшчык А. І. Савіч — на станцыі Калінкавічы, на аэрадроме ля вёскі Бокаў і ў іншых месцах. Рацыя паспяхова працавала да канца лістапада 1943 г., пакуль хапала электрасілкавання. Затым радыстка з рацыяй была перапраўлена ў Мазырскі партызанскі атрад.

### Падпольная група Ц. Я. Абрамава

Восенню 1941 г. супрацоўнік Палескага абласнога ўпраўлення НКУС Ц. Я. Абрамаў быў накіраваны ў спецыяльную школу, дзе праходзіў падрыхтоўку для барацьбы з ворагам у яго тыле. У кастрычніку 1941 г. разам з баявымі сябрамі Раманам Казачэнкам, Купрэем Мельчанкам, Сцяпанам Пакаціным, Адамам Харланчуком накіраваны ў Мазыр.

Цімафей Яўсеевіч прыйшоў да бургамістра горада падпольшчыка Васіля Крыцкага і быў прызначаны ім на работу грузчыкам. Абрамаў меў магчымасць бываць у гарнізонах ворага, ездзіць па горадзе, заўважаць усё, што цікавіла яго як разведчыка, збіраць неабходныя звесткі. Да пачатку 1942 г. Абрамаву пры дапамозе Рамана Каза-



Ц. Я. Абрамаў

чэнкі, Купрэя Мельчанкі, Сцяпана Пакаціна, Мікалая Казарэза ўдалося стварыць падпольную групу, у якую ўвайшлі Аляксей Смародскі, Дзмітрый Карасёў, Емяльян Прахарэнка і іншыя. А ў студзені 1942 г. да іх далучыўся брыгадны ветурач Мікалай Говараў, прысланы Жытомірскім падпольным цэнтрам для сувязі з Мазырскім падполлем. Падпольшчыкі пісалі лістоўкі і расклейвалі іх. Асабліва нервова гітлераўцы рэагавалі на паведамленні Саўінфармбюро аб разгроме нямецкіх войск пад Масквой. Цімафей Яўсеевіч устанавіў сувязь з адным арганізатарам Мазырскага падполля Рыгорам Чавусам і яго баявымі саратнікамі — Станіславам Петрасяком і Лук'янам Мацвеевым.

У Мазыры і яго ваколіцах пачаліся дыверсіі. Падпольшчыкі знішчалі нямецкіх акупантаў і іх стаўленікаў. ЦК КП(б)Б і камандаванне Чырвонай Арміі атрымлівалі каштоўныя даныя аб праціўніку ў горадзе і на тэрыторыі раёна.

Абрамаў быў чалавекам кіпучай энергіі, кемлівы і бясстрашны ў барацьбе з ворагам. Яго кватэра часта ператваралася ў штаб. Нярэдка тут збіраліся Казачэнка, Казарэз, Гармаш, Харланчук, Пакацін і іншыя.

На прапанову таварышаў пайсці ў партызаны Цімафей Яўсеевіч адказваў: «Не, я павінен да канца выканаць свой абавязак...» А хутка наступіла трагічная развязка.

«У тую ліпеньскую ноч, — успамінае жонка падпольшчыка Соф'я Ніканораўна Абрамава, — муж доўга размаўляў у кватэры з падпольшчыкам Смародскім, які падтрымліваў сувязь з партызанамі. Я, як заўсёды, знаходзілася ў двары і назірала. Смародскі пайшоў. Праз пяць мінут да дома пад'ехала грузавая машына з эсэсаўцамі. Яны акру-



Дом на вул. Калініна, 6, дзе была явачная кватэра падпольшчыкаў




Мемарыяльная дошка на доме, дзе ў 1941—1942 гг. знаходзілася явачная кватэра падпольшчыкаў

жылі дом, уварваліся ў кватэру. Цімафей паводзіў сябе спакойна. Апранаючыся, ціха сказаў: «Трымайся!» Яго штурханулі ў спіну і павялі. Адразу ж папярэдзіла Смародскага, той паспеў схавацца».

Жудасныя катаванні давялося вытрымаць Абрамаву, але нішто не зламала яго волю. На восьмыя суткі гестапаўцы, раз'юшаныя стойкасцю і нескаронасцю падпольшчыкаў, расстралялі яго, а таксама Рамана Казачэнку і яшчэ некалькі дзесяткаў патрыётаў. Было Абрамаву 24 гады...

* * *

На другі дзень схапілі Соф'ю Нікanoраўну разам з двума маленькімі дзецьмі (сыну было тры месяцы). Фашыст, які дапытваў яе, дабіваўся, з кім сустракаўся муж. У пакоі, дзе вёўся допыт, на падлозе ляжаў чалавек з адрэзанымі вушамі і выкалатымі вачыма. Гэта, на думку катаў, павінна было ўздзейнічаць на маладую жанчыну. Спробы дабіцца ад Соф'і Нікaноpаўны паказанняў нічога не далі. Збітую і акрываўленую, яе выкінулі разам з дзецьмі на вуліцу.

Пасля вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Соф'я Нікaноpаўна ў адной з камер былой турмы знайшла накрэсленыя вострым прадметам словы: «Бывай, сям'я. Бывай, Радзіма» і літары «Т. Е. А.». Няма сумнення, гэта напісаў Цімафей Абрамаў перад расстрэлам.

... У Мазыры, у ціхім завулку імя Калініна, стаіць стары драўляны дом. Мемарыяльная дошка сведчыць, што ў гэтым будынку ў 1941—1942 гг. знаходзілася явачная кватэра патрыятычных груп Мазыра. У гэтым доме жыла сям'я Цімафея Яўсеевіча Абрамава.

*А. Васько*

## Незламаная воля

Пасля гібелі кіраўніка падпольнай групы Ц. Я. Абрамава ўвесь цяжар кіраўніцтва барацьбой лёг на плечы М. М. Говарава. Сын малазямельнага селяніна з Курскай вобласці, ён 19-гадовым хлапчуком храбра змагаўся ў конніцы Катоўскага. Пасля грамадзянскай вайны — вучоба ў Харкаўскім ветэрынарным інстытуце, затым зноў служба ў Чырвонай Арміі.

Айчынная вайна заспела яго ў пагранічным горадзе Самборы на Украіне. На Паўднёва-Заходнім фронце Говараў удзельнічаў у цяжкіх баях, адступаючы да Дняпра.

Восенню 1941 г. у адным з жорсткіх баёў на Украіне частка коннікаў, у тым ліку і Говараў, трапілі ў акружэнне, а затым у палон. У ноўгарад-валынскім канцлагеры Мікалай Міхайлавіч устанавіў сувязі з камандзірамі Чырвонай Арміі Старчанкам, Смірновым і іншымі вязнямі.

Хутка патрыёты з падпольнага цэнтра Жытоміра Барадзін, Пратасевіч і Слючэнка праніклі ў канцлагер і дапамаглі некаторым вязням, у тым ліку Говараву, Смірнову і Старчанку, выбрацца на волю. Усе яны былі накіраваны Жытомірскім падпольным партыйным цэнтрам у розныя гарады. Так Мікалай Міхайлавіч апынуўся ў Мазыры. «Ён меў цвёрды намер узняць на барацьбу з акупантамі ўсіх сумленных

і смелых людзей»,— успамінае былы камандзір 1-га Малдаўскага злучэння партызан Е. А. Старчанка. (1-е Малдаўскае злучэнне партызан у пачатку 1943 г. фарміравалася на тэрыторыі Лельчыцкага і Мазырскага раёнаў.)

Па прапанове М. М. Говарава яўкі падпольшчыкаў былі перанесены ў ветлячэбніцу, часткова — у яго кватэру. Гэта забяспечвала большую канспірацыю, лепшую сувязь з людзьмі.

Народныя мсціўцы праніклі амаль ва ўсе тылавыя службы ворага, ні ўдзень, ні ўначы не даючы спакою захопнікам. Мікалай Міхайлавіч і Раман Казачэнка ўдзельнічалі ў дыверсіі па знішчэнні гебітскамісара Мазыра. Летам 1942 г., знаходзячыся ў вёсцы Міхалкі, ён устанавіў, што на мясцовым маслазаводзе скапілася вялікая колькасць масла, смятаны, сыру. Звязаўся з партызанамі Сычовым і Казловым. Наступнай ноччу ўся прадукцыя маслазавода была адпраўлена партызанам.

Мікалай Міхайлавіч валодаў рэдкай вытрымкай, душэўным спакоем, шчырасцю і шчодрасцю сэрца. Невыпадкова работнікі ветлячэбніцы Шэмет Міхаіл Сяргеевіч, Іванова Кацярына Міхайлаўна, Ларывон Макарчук, Ганна Сафронава і яе сын Мікалай, Марыя Ліс і іншыя ахвотна дапамагалі Говараву ў цяжкай і небяспечнай падпольнай рабоце.

Вестка аб акружэнні гітлераўскіх войск пад Сталінградам выклікала ў Мікалая Міхайлавіча незвычайны прыліў сіл і радасці. Ён не спаў начамі, пісаў лістоўкі, планаваў новыя ўдары па ворагу.

У канцы 1942 г. зноў пачаліся арышты падпольшчыкаў. Аднымі з першых былі схоплены партызанскія сувязныя Сергіевіч і Мелехаў, але пры канваіраванні ў гестапа яны змаглі ўцячы і трапілі да партызан. У хуткім часе былі арыштаваны М. М. Говараў, М. С. Шэмет, Емяльян Прахарэнка, Адам Харланчук, Лук'ян Мацвееў. Пачаліся жорсткія допыты, катаванні, якім супрацьстаялі жалезная стойкасць патрыётаў. Аднойчы начальнік мазырскай жандармерыі обер-лейтэнант Карл Кіцман падышоў да змучанага Мікалая Міхайлавіча і, стрымліваючы злосць, сказаў: «Не разумею вашага фанатызму і ўпартасці, усё роўна будзеце зломлены. Навошта ўпартасць і супраціўленне?»

Больш як месяц здзекаваліся каты з падпольшчыкаў, але нішто не зламала волю патрыётаў. Зімой 1943 г. Говараў, Шэмет, Прахарэнка, Харланчук, Мацвееў, Казлоў і іншыя савецкія патрыёты былі расстраляны...

*І. Ветраў, А. Духанін, А. Жыльскі*

## Не стаяў убаку

### З успамінаў Р. Ф. Раднеўскай

Мой муж Сяргей Паўлавіч Раднеўскі ў першыя дні вайны быў мабілізаваны на фронт. Восенню 1941 г., вярнуўшыся з акружэння, Сяргей адразу ўступіў у гарадскую падпольную арганізацыю. Дастаў радыёпрыёмнік, які схаваў перад адыходам у армію. Да нас прыходзілі слухаць радыё К. М. Бакун, А. Ф. Суркоў, Д. А. Казлоўскі, К. В. Катлінскі і іншыя. Сяргей пасылаў мяне ў гэты час вартаваць на вуліцу.

Каб прыдаць дому нежылы выгляд, вокны дома забілі дошкамі. Нярэдка прыходзілі партызаны, запісвалі зводкі Саўінфармбюро. У нас бываў і Жэня Талкачоў, якога падпольшчыкі часта пасылалі ў Калінкавічы, Казарэз, Мураўёў, Крыцкі і іншыя падпольшчыкі. Сяргей Паўлавіч час ад часу наведваў па сваіх падпольных справах партызанскі атрад.

Восенню 1942 г. навісла пагроза арышту мужа. Мы рашылі пайсці ў партызанскі атрад. Але па даносу здрадніка Сяргей Паўлавіч быў арыштаваны. Дом акружылі, муж спрабаваў уцячы праз акно, але вакол дома стаялі немцы і паліцэйскія. Нямецкі афіцэр

ударыў мяне бізуном. Мужа павялі, больш яго я не бачыла...

На другі дзень я пайшла ў турму — даведацца пра мужа. Мне сказалі, што яго адправілі ў Жытомір.

Сяргей Паўлавіч пасмяротна ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

### Падпольшчык і партызан

#### З успамінаў Г. М. Чавус, былой падпольшчыцы

Г. М. Чавус



23 чэрвеня 1941 г. мой муж Р. А. Чавус быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Камандаваў узводам у 75-й стралковай дывізіі. Я ў гэты час была ў Мазыры з двума дзецьмі, цяжарная трэцім, таму эвакуіравацца не магла.

З мужам я нечакана сустрэлася ў кастрычніку 1941 г. у вёсцы Акулінка, куды ён прыйшоў пасля ўцёкаў з чарнігаўскага лагера ваеннапалонных. 75-я дывізія, у якой муж ваяваў, была разбіта ворагам у раёне Прылук на Чарнігаўшчыне, дзе ён і трапіў у палон. Муж пацікавіўся, што робіцца ў Мазыры, ці шмат у горадзе немцаў. Я вярнулася ў Мазыр, мы дамовіліся, што хутка і ён прыйдзе дамоў.

Немцы вывесілі аб'явы аб рэгістрацыі мужчын. Рыгор Антонавіч не хацеў ісці на рэгістрацыю, але я ўгаварыла, каб не падвяргаць небяспецы сям'ю. Вярнуўшыся, ён паведаміў, што ў Мазыры ёсць нашы людзі. Уладкаваўся на працу манцёрам у нямецкую вайсковую часць, якая размяшчалася ў Козенках. Разам з мужам там працавалі С. П. Петрасяк і М. С. Казарэз. Я бачыла, як ён прыносіў дамоў жалезную скрынку, на дне якой ляжалі патроны. Аднойчы ўбачыла і два пісталеты. Прыносіў дэталі радыёпрыёмніка, правады. Вечарамі амаль не бываў дома. Да яго часта прыходзілі Яўген Талкачоў, Сяргей Раднеўскі, Андрэй Суркоў, Станіслаў Ракіцкі, Мікалай Казарэз, Цімафей Абрамаў, Аляксей Смародскі.

7 лістапада 1941 г. Рыгор Антонавіч сказаў, што слухалі па радыё Маскву. А ў пачатку 1942 г. гітлераўцы арыштавалі некалькі падпольшчыкаў. Пагроза арышту навісла і над мужам. Ён вымушаны быў пайсці ў партызанскі атрад.

Муж некалькі разоў прыходзіў з партызанскага атрада, сустракалася я з ім ва ўрочышчы Сідзельнікі, недалёка ад Мазыра. Рыгор Антонавіч расказваў, што яны на Прыпяці абстралялі баржу, у Юравічах выратавалі ад знішчэння яўрэйскую сям'ю Карчавых.

У 1943 г. паліцыя і гестапа рабілі часта на кватэры вобыск, дапытваліся пра мужа. Але яго ўжо не было ў жывых. 17 кастрычніка 1942 г. Рыгор Антонавіч загінуў у баі з акупантамі каля вёскі Нахаў Калінкавіцкага раёна.

### Юны змагар

На цэнтральнай вуліцы Мазыра, недалёка ад кінатэатра «Радзіма», на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «Тут у 1940—1941 гадах вучыўся Яўген Талкачоў, адважны партызан-разведчык, які гераічна загінуў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі».

Калі пачалася вайна, падлетак Жэня папрасіўся ў ваенкамаце на фронт. Яму адмовілі. У першыя дні акупацыі Мазыра Талкачоў звязаўся з падпольшчыкамі. Нікому не кідаўся ў вочы хлопчык, які нібыта без справы сноўдаўся па вуліцах. Ён незаўважна падыходзіў да патрэбнага дома, стукаў у дзверы.



Я. І. Талкачоў

— Слухаю цябе, Жэня,— гаварыў, адчыняючы дзверы, Мікалай Казарэз, падпольшчык, камуніст.

— На вуліцах устаноўлены вітрыны для загадаў нямецкай камендатуры,— гаварыў напаўголаса хлопчык.— Зачыняюцца яны сеткай з дроту, замкі нескладаныя. Вакол камендатуры калючы дрот...

Затым Талкачоў запісваў зводкі Саўінфармбюро, а ноччу прабіраўся да вітрын, адмыкаў іх і на загады камендатуры наклейваў свежыя зводкі.

Аднойчы падпольшчыкам стала вядома, што з Жытоміра прыбыў у Мазыр фашысцкі палкоўнік, які павінен быў праводзіць у гарадскім тэатры нараду афіцэраў СС і гестапа.

— Нельга дапусціць, каб наш горадператварыўся ў нямецкі адміністрацыйны цэнтр, дзе будуць прымацца рашэнні аб сумесных аперацыях супроць партызан і мірных жыхароў,— гаварыў камандзір падпольнага цэнтра К. М. Бакун.— Трэба сарваць сустрэчу.

Хутка ўзнік план. Аперацыю было даручана правесці Дзмітрыю Казлоўскаму, Яўгену Талкачову і Канстанціну Катлінскаму.

За некалькі гадзін да пачатку нарады Жэня прабраўся ў памяшканне тэатра. Ён ужо ведаў, што там, у правым крыле, стаялі бочка з пакостам і фарба. Ды і з сабою захапіў сяго-таго...

А калі ў зале загрымела «Хайль Гітлер!», Жэня запаліў пакост і фарбу. Сцэны да гэтага абліў бензінам...

Вартавыя, убачыўшы, як з вокан тэатра паваліў дым, адкрылі стральбу. Нарада немцаў была сарвана.

У сярэдзіне студзеня 1942 г. падпольшчыкі даведаліся, што праз 3—4 дні ў Акцябрскі раён выедуць карнікі. Трэба было папярэдзіць партызан. Выканалі гэта заданне Кузьма Бакун і Жэня Талкачоў. Партызаны змаглі падрыхтавацца да «сустрэчы».

Шмат смелых аперацый было на рахунку юнага падпольшчыка. Адна з іх — удзел у падрыве электрастанцыі.

Пазней Жэня з'яўляўся ў Мазыры, але ўжо па заданні партызанскага атрада, дзе ён змагаўся. Загінуў Яўген Талкачоў пад Калінкавічамі ў няроўным баі з фашыстамі.

*Ю. Герасіменка*

## Удзельнікі антыфашысцкага падполля, якія змагаліся на Мазыршчыне і загінулі на тэрыторыі раёна і за яго межамі

**Група партыйна-савецкага актыву, пакінутая партыйнымі органамі ў тыле ворага ў 1941 г.**

**АНТОНЕНКА Іван Рыгоравіч,** н. у 1900, старшыня калгаса ў в. Каменка. У кастрычніку 1942 уступіў у партызанскае злучэнне С. Каўпака, загінуў у 1943 у Кіеўскай вобл.

**ГАФШТЭЙН Шалом Меeравіч,** н. у 1893, старшыня калгаса ў в. Чарамашня, закатаваны ў 1941.

**ГНЕДЗЬКА Дзяніс Максімавіч,** н. у 1901, старшыня калгаса «Мазыршчына» ў в. Слабада, расстраляны ў студзені 1943.

**ДУБАВЕЦ Мікалай Адамавіч,** н. у 1910, старшыня Мялешкавіцкага сельспажыўтаварыства, расстраляны 8.1.1942.

**КАМЯНЕЦКІ Фёдар Апанасавіч,** н. у 1893, нам. старшыні райвыканкама, расстраляны 8.1.1942.